***Пыжык Н. М.**, наменік дырэктара па асноўнай дзейнасці дзіцячага сада № 21 г. Барысава Мінскай вобласці*

# Я ганаруся тым, што беларус!

## Свята, прысвечанае Дню Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь для старшай групы дзіцячага сада

***Задачы:*** фарміраваць уяўленні пра дзяржаўнае свята — Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь; развіваць уменні расказваць пра дзяржаўнае свята, прымаць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і святкаванні; выхоўваць пачуццё патрыятызму і любові да Радзімы, паважлівае стаўленне да гісторыі і культуры сваёй краіны.

***Абсталяванне:*** фанаграмы песні «Калі ласка» (сл. і муз. народныя), Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь (сл. М. Клімковіча, У. Карызны, муз. Н. Сакалоўскага), песні «Беларусь — мой дом» (сл. І. Бейня, муз.  І. Бейня), песні «Маладая Беларусь» (муз. А. Марчук, сл. А. Чэпікава, Р. Калодкі), полькі-янкі (беларускі народны танец), песні «Няма другой такой» (сл. і муз. В. Мусвідас); беларускія музычныя інструменты: бубны, лыжкі, трашчоткі, званочкі — па колькасці дзяцей;  мультымедыйная прэзентацыя «Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь», штучныя кветкі (валошкі, рамонкі, канюшына, лён і інш.), стужкі чырвонага і зялёнага колеру па колькасці дзяцей, сцягі чырвонага і зялёнага колеру па колькасці дзяцей, падарункі — магніты з выявамі сімвалаў беларускага арнаменту (жыццё, сям’я, вясна, сонца) па колькасці ўдзельнікаў.

*Дзеці ў беларускім адзенні ўваходзяць у святочна ўпрыгожаную залу пад музыку і становяцца паўкругам.*

**Вядучы:** На свята веснавой пары

У наш садочак запрашаем!

Мы рады бачыць вас, сябры,

І толькі добрага жадаем!

*Гучыць песня «Калі ласка».*

**Вядучы:** Добры дзень, дзеці! Я рада вітаць вас на свяце, прысвечаным Дню Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь.

*На экране — дзяржаўныя сімвалы Беларусі.*

**Дзеці:**

Жывём мы шчаслівыя у Беларусі,

І кожны з нас скажа: «Я ганаруся!

Радзімай сваёй сінявокай,

Гісторыяй блізкай, далёкай».

Гасцей ў нашай зале сёння багата,

Бо мы адзначаем дзяржаўнае свята —

І разам спяваем гімн нашай краіны,

Сваёй незалежнай маці-айчыны! (*Наталля Пыжык*)

*Гучыць Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь На экране — тэкст гімна.*

**Вядучы:** Кожны чалавек мае Радзіму. А што такое Радзіма? *(Адказы дзяцей.)* А пачынаецца Радзіма з пяшчотнай песні маці, з роднага беларускага слова…

**Дзеці:**

Беларусь — мая Радзіма,

Ганаруся я табой.

Беларусы — бацька, маці

І маленькі брацік мой.

Я — сапраўдны беларус,

Не цураюся роду!

Знаю мову, люблю песні
Роднага народу.

Вырастаці буду хутка,
Як у дождж грыбочак.
Беларусь — мая матуля,
Я — яе сыночак!

Так, мы дзеці-беларусы:
Хлопцы і дзяўчаты.
Родны край наш — Беларусь,
Прыгожы і багаты!

Будзем мы яго любіць,
Праслаўляць бясконца.
Веру, будучае наша
Будзе ззяць, як сонца! (*Таццяна Кармалыс*)

*Гучыць песня «Беларусь — мой дом» (сл. і муз. І. Бейня).*

**Вядучы:** Кожны народ мае сваю сімволіку — свой герб, сцяг, гімн. Гэта сімвалы, якія адрозніваюць адну дзяржаву ад другой. *(На экране — Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь.)* Якія колеры прысутнічаюць на сцягу Рэспублікі Беларусь? *(Адказы дзяцей.)* Што яны значаць? *(Адказы дзяцей.)* А вось гэты прыгожы ўзор размешчаны не проста так, гэта беларускі арнамент-абярог, які ахоўвае нашу беларускую зямлю. Паглядзіце, у цэнтры знаходзіцца ромб. Хто ведае, што азначае гэты сімвал? *(Адказы дзяцей.)* А з бакоў — сімвалы багацця і дабрабыту. Вось які прыгожы наш беларускі сцяг.

Я бачу, што вы падрыхтаваліся да нашага свята і павязалі на рукі стужкі зялёнага і чырвонага колеру, таму прапаную вам пагуляць у гульню пад назвай «Каляровыя загадкі».

**Гульня «Каляровыя загадкі»**

Вядучы загадвае загадкі. Калі адгадка зялёнага колеру, то збіраюцца ў круг тыя, у каго на руцэ стужка зялёнага колеру, калі адгадка чырвонага колеру — збіраюцца тыя, у каго стужка чырвоная.

1. На градцы зялёны, у бочцы салёны. *(Агурок.)*

2. Сядзяць паненачкі ў чырвоных сукеначках, хто ідзе, дык паклоніцца. *(Суніцы.)*

3. Заўсёды, летам і зімой, мае іголачкі са мной,
Галінак у мяне багата, я сустракаю з вамі свята. *(Елка.)*

4. Чый каптанік у гарошкі,
Ёсць і крылцы, ёсць і ножкі,
І прыгожая галоўка?
Гэта … (*божая кароўка*)[1].

5. Не агонь, а пячэцца. *(Крапіва.)*

**Вядучы:** Беларусы вельмі ветлівы народ, які ўмее добра працаваць, весела святкаваць, ганарыцца і паважае сімвалы сваёй краіны.

*Музычна-спартыўная кампазіцыя са сцягамі чырвонага і зялёнага колеру «Маладая Беларусь».*

*На экране — Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь*

**Вядучы:** Паглядзіце, як прыгожа ўбраны наш святочны зал, колькі тут дзіцячых усмешак і сонечнага святла. А ці ведаеце вы, што раней для дабрабыту і дастатку ў кожнай беларускай хаце абавязкова трымалі калоссе збожжа? *(Вядучы паказвае на вазу з калоссем збожжа.)* Такі букет упрыгожвалі кветкамі, каб будучы ўраджай быў яшчэ лепшы. Я прапаную вам выбраць кветкі і для нашага святочнага букета. *(Вядучы дэманструе розныя штучныя кветкі, дзеці выбіраюць, ставяць у вазу з калоссем званочкі, рамонкі, канюшыну і г. д.)* Які самабытны букет атрымаўся! Паглядзіце ўважліва, а якія расліны з нашага

---

[1] Галіноўская, Н. Чый каптанік у гарошкі? /Н. Галіноўская // залатыя зярняты : тлумачальна-перакладны слоўнік. 2 клас ; М. І. Верціхоўская. — Мінск : Пачатковая школа, 2009. — 176 с.

букета ёсць на гербе Рэспублікі Беларусь? *(Адказы дзяцей.)* А зараз, калі ласка, паслухайце пра герб нашай Радзімы.

*Вядучы чытае верш, на экране дэманструюцца элементы герба.*

**Герб** — сімвал незалежнасці дзяржавы,

Яе народ наш атрымаў па праву.

У цэнтры герба: **шар зямны** — знак роўнасці народаў,

Знак міру, дабрабыту і свабоды.

**Звязда** — знак мужнасці,

**Пяць прамянёў** — сяброўства кантынентаў,

**Калоссе збожжа** — Беларусі дыяменты.

Квітнее **канюшына**, **сіні лён**,

Як гаспадаркі сельскай добры плён.

І **сонца** — з герба свеціць нам штодня,

Гасціннасць беларусаў, цеплыня. (*Наталля Пыжык*)

Мы, беларусы, павінны ганарыцца, што жывём у такой цудоўнай краіне, дзе пяюць жаўрукі, квітнеюць сады, каласіцца збожжа, а народ умее так весяліцца…

**Дзіця:** Беларускія музыкі,

Музыканты-дружбакі,

Да нас на свята завіталі,

Польку-янку заігралі. (*Наталля Пыжык*)

*Гучыць полька-янка.*

**Вядучы:** Дзеці, я прапаную вам прадоўжыць выраз:

1. Я ганаруся тым, што…
2. Сёння мы адзначалі свята…
3. Для мяне Беларусь — гэта…

*Выхаванцы выконваюць танец пад песню «Няма другой такой».*

**Вядучы:** Вось і скончылася наша свята. Спадзяюся, што тое, што вы пачулі і ўбачылі, закранула вашы сэрцы, выклікала пачуццё гордасці за нашу

Беларусь, за яе сённяшні дзень. Традыцыйна ні адно свята не абыходзіцца без пажаданняў і падарункаў. Калі ласка, трымайце….

*Выходзяць трое дзяцей, якія ў руках трымаюць сімвалы беларускага арнаменту: сімвал жыцця, сімвал вясны і сонца, сімвал сям’і — і чытаюць верш.*

**Дзеці:**

**1-е дзіця:** Хай жыццё падорыць нам багата,

**2-е дзіця:** Вясну і сонца ў нашу хату.

**3-е дзіця:** Шчаслівай будзе кожная сям’я

**Усе разам:** Здароўя, міру і дабра! (*Наталля Пыжык*)

*Усе ўдзельнікі свята атрымліваюць магніты з беларускімі арнаментамі, якія сімвалізуюць жыццё, вясну і сонца, сям’ю; гучыць беларуская музыка, на экране выявы беларускай прыроды.*